УДК 37:355.233.231.1

# Аб моўнай сітуацыі і ролі выкладчыка ў выхаванні патрыятызму ў сучаснай моладзі

Н.В. Ратынская, А.А. Носік
Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт

Сёння перад грамадскасцю і насельніцтвам нашай рэспублікі паўстае нямала складаных праблем, якія закранаюць свядомасць і пачуцці мільёнаў жыхароў. Гэта праблемы захавання і развіцця нацыянальнай беларускай культуры, роднай мовы, звычаяў, адраджэння гістарычнай і культурнай спадчыны, пытанні дзяржаўнага суверэнітэту. Адна з галоўных задач у развіцці беларускай культуры – клопат пра беларускую мову, якая павінна заняць сваё дастойнае месца ў жыцці беларускага народа. “Кожны народ мае хаця б адзін геніяльеы твор. І гэты твор – мова”, – так сказаў наш сучаснік, беларускі паэт Алесь Разанаў. Наш народ склаў гэты геніяльны твор, хоць шлях яго быў вельмі складаным і пакручастым, а часам – драматычным.

Іншамоўнае панаванне на землях сучаснай Беларусі, якое працягвалася многія стагоддзі, загнала беларускае слова пад сялянскія стрэхі, дзе яно існавала выключна ў вуснай разнавіднасці. І прыходзіцца нават здзіўляцца, як беларуская мова змагла выжыць у тагачасных умовах. Але – выжыла. І не толькі выжыла, але і пачала бурна развівацца, асабліва ў першыя два дзесяцігоддзі ХХ ст., набыла статус дзяржаўнай мовы, пацверджаны Канстытуцыяй БССР 1927 года.

У 30 – 80-я гады беларуская мова, мова карэннага насельніцтва, зноў неапраўдана выціскалася з грамадскага ўжытку, сфера яе карыстання звужалася. Сітуацыя змянілася на пачатку 90-х гадоў, калі быў прыняты Закон “Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь”, згодна з якім дзяржаўнае чыноўніцтва павінна было авалодаць беларускай мовай у аб’ёме,

неабходным для выканання службовых абавязкаў. Сапраўды, пачалося пашырэнне сферы ўжывання беларускай мовы ў службовым справаводстве рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады і кіравання. Пашырылася сетка школ з беларускай мовай навучання.

Але як і ў далёкія 20-я гады, калі перыяд адраджэння беларускай культуры працягваўся фактычна чатыры гады, так і ў 90-я гэты перыяд быў не большы. Па выніках рэферэндуму, што адбыўся 14 мая 1995 года, у нашай краіне сталі дзве дзяржаўныя мовы – беларуская і руская. Першачарговым клопатам дзяржавы павінна было стаць забеспячэнне раўнапраўя дзвюх моў, што ў канчатковым выніку зводзіцца да аднолькавага валодання імі кожным грамадзянінам і выкарыстання на практыцы абедзвюх моў. Вынікі рэферэндуму не змяняюць патрабаванняў да кожнага грамадзяніна, асабліва да службовых асоб і дзяржаўных дзеячаў, аднолькава добра валодаць беларускай і рускай мовамі і практычна ўжываць іх у сваёй дзейнасці.

Нацыянальная мова – гэта адзін з найважнейшых фактараў, дзякуючы якому тая ці іншая нацыя можа выканаць сваю гістарычную місію на зямлі, быць непадобнай да іншых, развіваць свой духоўны патэнцыял. Успамінаюцца словы выдатнага рускага пісьменніка Канстанціна Паўстоўскага, які гаварыў: “Годнасць чалавека правяраецца яго адносінамі да роднай мовы. Чалавек, які не ведае роднай мовы – дзікун”.

Высокі матэрыяльны дабрабыт вымагае і высокага духоўнага забеспячэння, а духоўнасць магчыма пры ўмовах захавання нацыянальных каштоўнасцей, якія прайшлі выпрабаванні часу. Статыстыка паказвае, што ў 1999/2000 навучальным годзе 18,2% дзяцей выхоўваліся на беларускай мове ў дашкольных установах, 30,5% вучняў сярэдніх школ навучаліся на беларускай мове, праўда, у прафесійна-тэхнічных вучэбных установах выкладанне ўсіх прадметаў, за выключэннем беларускай мовы і літаратуры, ажыццяўлялася

на рускай мове. У ВНУ на 1 кастрычніка 1999 года 64,9% студэнтаў вучыліся на рускай мове, 7,5% - на беларускай і 27,6% - на рускай і беларускай мовах.

Трэба цярпліва падымаць аўтарытэт беларускай мовы, нашай нацыі, нашай Беларусі. І трэба зразумець, што адрадзіць беларускі этнас, яго культуру і духоўнасць адна толькі школа не зможа, якія б грандыёзныя навучальныя планы ці звышнавуковыя канцэпцыі мы ні рэалізоўвалі. Выкладчыка беларускай мовы не можа не цікавіць пытанне, як ставіцца моладзь да беларускай мовы, ці адчуваюць сябе маладыя людзі беларусамі і што гэта для іх значыць. З 1997 па 2001 гг. студэнтам-медыкам было прапанавана адказаць на пытанні: “Ці асэнсоўваеце вы неабходнасць авалодвання нацыянальнай мовай дзяржавы, у якой жывяце?” і “Як бы вы жадалі вывучаць беларускую мову ў нашай установе: а) як прадмет у вучэбным плане, б) як факультатыўны курс, в) у гуртку, г) супраць усялякага вывучэння?” Вынікі апытвання наступныя:

| Год наву-чання | К-ць апыта-ных | Мова як прадмет | Мова як факульта-тыў | Мова як гуртoк | Супраць выву-чэння | Усяго | Не асэнсоў-ваюць |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1997/ 1998 | 432 | 114 | 185 | 127 | 6 | 380 | 52 |
| 1998/ 1999 | 448 | 201 | 135 | 109 | 3 | 391 | 57 |
| 1999/ 2000 | 429 | 240 | 113 | 52 | 3 | 387 | 32 |
| 2000/ 2001 | 377 | 170 | 104 | 95 | 8 | 337 | 40 |

Як бачым, нашы студэнты сур’ёзна ставяцца да моўнай праблемы. Большасць з іх лічыць, што неабходна валодаць нацыянальнай мовай той краіны, у якой жывеш. Гэта пацвярджаецца і адказамі на пытанне, якое было зададзена ў 2011 годзе: “Як вы лічыце, у нашай рэспубліцы дзяржаўнай павінна быць толькі беларуская мова, ці вы за двухмоўе?”. З 337 студэнтаў за двухмоўе выступілі 45 чалавек (13%) і 232 чалавекі (67%) падрабязна патлумачылі, чаму ў нашай краіне толькі беларуская мова павінна быць дзяржаўнай.

У бягучым 2014/2015 навучальным годзе мы спыталіся ў сваіх студэнтаў: “Ці згодны вы вывучаць медыцынскія дысцыпліны па-беларуску і затым карыстацца беларускай мовай пры выкананні службовых абавязкаў, калі для гэтага будуць створаны адпаведныя ўмовы: падрыхтаваны выкладчыкі і выдадзены падручнікі на беларускай мове па медыцынскіх дысцыплінах?” З 385 апытаных 210 згодны, 175 – не. Але катэгарычных адказаў “не” літаральна адзінкі, бо побач падаюцца абгрунтаванні, якія дазваляюць зрабіць наступную выснову: моладзь не супраць выкарыстоўваць сваю мову нават пры выкананні службовых абавязкаў. Яна разумее, што мова значыць для нацыі, і выразна бачыць прычыны, чаму наша мова знаходзіцца на задворках..

Нашы студэнты – гэта далёка не ўся моладзь. Беларусь, на жаль, з’яўляецца той краінай, у якой народ не аб’яднаны адной гістарычнай памяццю і агульнай мовай. А народ без веры, без ідэі, без маралі, без нацыянальнай свядомасці – гэта цеста, з якога можна рабіць усё, што заўгодна. Трэба будзіць нацыянальную годнасць народа, выхоўваць беражлівыя адносіны да сваёй духоўнай спадчыны, бо адносіны да мовы продкаў выяўляюць агульную культуру і грамадзянскую годнасць чалавека.